# Свята ва універсітэце

**На свеце шмат прафесій, але ёсць адна, якая робіць жыццё чалавека значным, напоўненым высакародным сэнсам. Бібліятэкар... Чалавек, для якога часткай жыцця становяцца людзі і кнігі.**

Кніга не толькі крыніца ведаў, а найперш тое, што павінна ўшаноўвацца як нешта сакральнае. Зацікаўленасць той ці іншай кнігай ёсць, безумоўна, зацікаўленасць яе аўтарам, пранікненне чытачоў у яго ўнутраны свет.

Штогод 15 верасня адзначаецца прафесійнае свята супрацоўнікаў бібліятэк і чытачоў — Дзень бібліятэк. З гэтай нагоды ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў прайшоў Тыдзень бібліятэкі. Пачыналася свята сустрэчай з пісьменніцай Раісай Баравіковай. Адкрыла мерапрыемства дырэктар бібліятэкі Аксана Барысаўна Валодзіна. Р. Баравікова захапляльна расказвала выкладчыкам, студэнтам, супрацоўнікам бібліятэкі і універсітэта пра свой жыццёвы і творчы шлях. Вельмі яскрава прадстаўляла змест сваіх фантастычных празаічных твораў, па-майстэрску чытала свае вершы. Сустрэча атрымалася цёплай, цікавай, запамінальнай для ўсіх прысутных.



10 верасня бібліятэка ладзіла сустрэчу яшчэ з адным пісьменнікам — Сяргеем Клімковічам. Таленавіты малады аўтар стварае цудоўныя кнігі сучаснай тэматыкі на рускай мове. Тым не менш, пісьменнік шмат гаварыў з аўдыторыяй на добрай літаратурнай беларускай мове. Вельмі цікава расказваў пра свае кнігі "Танцует осень», «Три строки о радости, три строки о грусти», «Забвение сердец» ды іншыя.

У рамках Тыдня бібліятэкі ва універсітэце было праведзена яшчэ шэраг цікавых мерапрыемстваў: фотапрэзентацыя "У аб'ектыве — бібліятэкі Чэхіі, Італіі"; навучальны семінар для выкладчыкаў, супрацоўнікаў універсітэта, студэнтаў "Інавацыйны экспрэс: доступ да Баз дадзеных віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі".

Завершаны святочны тыдзень быў прэзентацыяй "Гаворыць і паказвае бібліятэка..." На экране, у холе універсітэта, на працягу дня прэзентацыя раскрывала розныя напрамкі работы універсітэцкай бібліятэкі, цікавыя праекты, ідэі, якія рэалізуюцца яе творчым калектывам.

Супрацоўнікі бібліятэкі БДУКМ у Дзень бібліятэк прымалі віншаванні ад рэктара універсітэта, дэканаў факультэтаў, выкладчыкаў, студэнтаў і калег.

**Таіса ГУРКО-СУПРАНОВІЧ,**
**вядучы метадыст бібліятэкі БДУКМ**

***На здымку:* *фота на памяць з пісьменніцай Р. Баравіковай.***